Сайт: http://вбиблио.бел/
Эл. пошта:
bn-22@vitobl.by
Тэлефон: 8 (02151) 6-32-95






краязнаўчы
КАЛЯНДАР

Верхнядзвінская цэнтральная раённая бібліятэка
імя Т. Хадкевіча

# Верхнядзвінскі край








## 2025

Падрыхтоўка тэксту, камп'ютарная вёрстка
і мастацкае афармленне Н. С. Глацёнак
Адказны за выпуск Л. А. Куўшынава

Надрукавана на ксераксе Верхнядзвінская цэнтральная
раённая бібліятэка імя Тараса Хадкевіча
211631 г. Верхнядзвінск, вул. Савецкая, д. 34
E-mail: bn-22@vitobl.by
Тыраж 15 экз.



# У 2025 годзе спаўняецца:

**65 гадоў** таму (1960) быў заснаваны **Музей краязнаўства** ў ДУА "СШ №2 г. Верхнядзвінска імя Н.В. Траян".

**80 гадоў** таму (1945) заснаваны **Пажарна-аварыйна выратавальны атрад г. Дрысы** (зараз г. Верхнядзвінск).

**265 гадоў** таму (1760) нарадзіўся **Цяцерскі Фаўстын Іванавіч** (1760-1832), святар, доктар філасофіі і тэалогіі, грамадскі дзеяч, мемуарыст. У 1801-1816 гг. — выкладчык дамініканскай калегіі ў Забелах Полацкага павета (зараз в. Валынцы).

**95 гадоў** таму (1930) нарадзілася **Мароз Аляксандра Аляксандраўна** (1930-1973), заслужаная настаўніца Беларусі. Ураджэнка в.Чурылава

**100 гадоў** таму (1925) нарадзіўся **Някрасаў Вікенцій Лявонавіч** (1925-1979), заслужаны настаўнік Беларусі (працаваў дырэктарам Бароўскай васьмігадовай школы).

**185 гадоў** таму (1840) пабудавана з цэглы **царква ў імя прападобнай Еўфрасінні Полацкай** у в. Бароўка.

**75 гадоў** таму (1950) заснаваны **"Прудзінкі"** як калектыўнае сельскагаспадарчае прадпрыемства "Кастрычнік", з 2003 — СВК з сучаснай назвай, зараз — ААТ.

**70 гадоў** таму (1955) выяўлены курганны могільнік крывічоў Зашчырына, **археалагічны помнік** у в. Зашчырына.

# СТУДЗЕНЬ

| | |
|---|---|
| **1 студзеня — 45 гадоў** | таму (1980) заснавана **УП “Верхнядзвінскае прадпрыемства меліярацыйных сістэм”**. |
| **1 студзеня — 80 гадоў** | таму (1945) заснаваны **ваенны камісарыят Верхнядзвінскага раёна**. |
| **3 студзеня — 25 гадоў** | таму (2000) заснаваны ландшафтны заказнік рэспубліканскага значэння **“Асвейскі”** . |
| **4 студзеня — 7 5 гадоў** | таму (1950) нарадзіўся **Барэйша Міхаіл (Міхась) Уладзіміравіч** (1950-1990), празаік, паэт, перакладчык. Ураджэнец в. Новы Строй. |
| **14 студзеня — 115 гадоў** | таму (1910) нарадзіўся **Забагонскі Сямён Аляксандравіч** (1910-1955), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1943). Ураджэнец в. Залучча Дрысенскага павета (цяпер у Верхнядзвінскім раёне) . |
| **20 студзеня — 55 гадоў** | таму (1970) заснавана **“Лявонішына”**, сельскагаспадарчае прадпрыемства.<br>З 2002 г. камунальнае ўнітарнае вытворчае сельскагаспадарчае прадпры-емства з сучаснай назвай. |
| **24 студзеня — 70 гадоў** | таму (1955) нарадзіўся **Краснік Васіль Аляксеевіч** (1955), дырэктар ААТ “Прудзінкі” Верхнядзвінскага раёна, Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь, лаўрэат звання “Чалавек года Віцебшчыны-2011”, Ганаровы грамадзянін Верхнядзвінскага раёна. Ураджэнец Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці. |

# ЛЮТЫ

**2 лютага — 95 гадоў** таму (1930) заснаваны калгас "Запаветы Ільіча". З 2003 г. — СВК "Баліны", з 2010 г. — **ААТ "Баліны"**.

# САКАВІК

**3 сакавіка — 65 гадоў** таму (1960) заснавана камунальнае ўнітарнае вытворчае сельскагаспадарчае прадпрыемства **"Каханавічы"**.

# КРАСАВІК

**1 красавіка — 95 гадоў** таму (1930) заснаваны калгас "Юны свет". Зараз ААТ **"Сакалоўшчына"**.

**1 красавіка — 20 гадоў** таму (2005) адкрыты ДУ "**Верхнядзвінскі раённы фізкультурна -спартыўны клуб**".

**14 красавіка — 280 гадоў** таму (1745) нарадзіўся **Фанвізін Дзяніс Іванавіч** (1745-1792), сатырык, драматург, перакладчык.
(У 1773 г. атрымаў у дар маёнтак Лісна Дрысенскага уезда. Працаваў над камедыяй "Выбар гувернёра").

**18 красавіка — 115 гадоў** таму (1910) нарадзіўся **Мілавідаў Ігар Мікалаевіч** (1910-1984), генерал-лейтэнант артылерыі ў Вялікую Айчынную вайну. Ураджэнец в. Падгароддзе Дрысенскага павета Віцебскай губерні (цяпер у Верхнядзвінскім раёне).

# МАЙ

**1 мая — 65 гадоў** таму (1960) нарадзіўся **Курэчка Чэслаў Мечыслававіч** (1960), айцец, пробашч парафіі Святой Тройцы ў Росіцы, лаўрэат звання “Чалавек года Віцебшчыны-2013”, лаўрэат прэміі “За духоўнае адраджэнне”. (в. Росіца).

**15 мая — 180 гадоў** таму (1845) нарадзіўся **Чэрскі Іван Дамінікавіч (Дзяменцьевіч)** (1845-1892), географ, геолаг, вядомы даследчык Сібіры. Ураджэнец ф.Свольна Дрысенскага павета (цяпер Верхнядзвінскім раён).

**18 мая — 85 гадоў** таму (1940) нарадзіўся **Старынскі Валерый Аляксандравіч** (1940-2015), паэт, член Беларускага літаратурнага саюза “Полоцкая ветвь”. Аўтар кніг вершаў. Ураджэнец в. Бароўка.

**19 мая — 135 гадоў** таму (1890) нарадзіўся **Макіёнак Данат Адамавіч** (1890-1941), адзін з першых расійскіх лётчыкаў-асаў, удзельнік Першай сусветнай вайны, кавалер Георгіеўскіх крыжоў 3 ступеней. Ураджэнец в. Дамбоўка Асвейскай воласці Дрысенскага уезда (цяпер Верхнядзвінскі раён).

**20 мая — 130 гадоў** таму (1895) нарадзіўся **Накоўнік Мікалай Іванавіч** (1895-1975), вучоны, інжынер-геолаг, доктар геолага-мінералагічных навук, прафесар, кавалер ордэна “Знак Пашаны”. Ураджэнец в. Накоўнікі, Каменскай воласці, Дрысенскага павета (цяпер Верхнядзвінскі раён).

**21 мая — 110 гадоў** таму (1915) нарадзілася **Фраленка Алена Уладзіміраўна** (1915-1999), беларускі вучоны ў галіне ўнутранай медыцыны, доктар медыцынскіх навук (1970), прафесар. Ураджэнка г.Дрыса (Верхнядзвінск).





**Генадзь Уладзіміравіч Капусцёнак** нарадзіўся 10 снежня 1925 года ў вёсцы Замошша ў сялянскай сям'і. 16-гадовым юнаком ён прыйшоў у атрад “Боевой”. Быў смелым і рашучым партызанам-разведчыкам, асабіста скінуў пад адхон пяць варожых эшалонаў, браў у палон гітлераўскіх салдат. У студзені 1943 года яму давялося абараняць сваю вёску.

У пасляваенны час Генадзь скончыў Кемераўскі коксахімічны тэхнікум і стаў металургам. Працаваў на Кемераўскім коксахімічным заводзе, а затым на Наваліпецкім металургічным камбінаце. Стаў выдатным спецыялістам. Працаваў начальнікам змены коксавага цэха. Паспяваў пасядзець і за пісьмовым сталом. Пісаў аб равесніках і сябрах, якія партызанілі і ваявалі на франтах Вялікай Айчыннай. Друкаваў нарысы ў раённай газеце “Дзвінская праўда”.

Узнагароджаны двума ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі і Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі “Партызану Айчыннай вайны I ступені”, “За перамогу над Германіяй”.



**Сяргей Мікалаевіч Грамадка** нарадзіўся 10 снежня 1960 года ў Слонімскім раёне Гродненскай вобласці.

Скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (г. Горкі), Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Сяргей Мікалаевіч працуе на пасадзе генеральнага дырэктара ААТ "Інвет" са студзеня 2004 года. За час працы зарэкамендаваў сябе высокакваліфікаваным, адукаваным і дасведчаным спецыялістам, ініцыятыўным і кампетэнтным кіраўніком. Вялікую ўвагу ў сваёй працы надае пытанням развіцця і мадэрнізацыі вытворчасці, навядзенню парадку і добраўпарадкаванню тэрыторыі прадпрыемства.

Пад кіраўніцтвам Сяргея Мікалаевіча праведзена работа па тэхнічным пераўзбраенні і мадэрнізацыі ААТ "Інвет". На прадпрыемстве асвоена новая высокатэхналагічная вытворчасць ратацыйнага фармавання.

Ганаровае званне "Чалавек года Віцебшчыны-2012" прысвоена за шматгадовую добрасумленную працу, асабісты ўклад у развіццё прадпрыемства. Раней Сяргею Мікалаевічу прысвойвалася ганаровае званне "Чалавек года Віцебшчыны-2008" .



**30 мая — 55 гадоў** таму (1970) нарадзіўся **Вабішчэвіч Валянцін Васільевіч** (1970), пратаіерэй, благачынны Верхнядзвінскага раёна, настаяцель храма свяціцеля Мікалая Цудатворцы г. Верхнядзвінска.

## ЧЭРВЕНЬ

**45 гадоў** таму (1980) адкрыта дзяржаўная ўстанова адукацыі **"Яслі-сад № 4"** г. Верхнядзвінска

**10 чэрвеня — 70 гадоў** Таму (1955) нарадзіўся **Палачанін Іосіф Мікалаевіч** (1955), ветэран працы (былы старшыня Верхнядзвінскага райвыканкама), Ганаровы грамадзянін Верхнядзвінскага раёна.

## ЛІПЕНЬ

**55 гадоў** таму (1970) заснавана Аўтабаза №13 Віцебскага абласнога аўтатранспартнага трэста. Зараз — **участак "Верхнядзвінск" Аўтобуснага парка № 2 г. Полацка**.

**7 ліпеня — 85 гадоў** таму (1940) нарадзіўся **Пячэрскі Ілля Юр'евіч** (1940-2010), былы генеральны дырэктар завода "Зааветінструмент" (цяпер ААТ "Інвет", аг. Бігосава) .

**10 ліпеня — 65 гадоў** таму (1960) назад нарадзіўся **Марковіч Ігар Іванавіч** (1960), старшыня Полацкага райвыканкама, Ганаровы грамадзянін Верхнядзвінскага раёна. Ураджэнец в. Ніжняе Фаміно Верхнядзвінскага раёна.

## ЖНІВЕНЬ

**40 гадоў** таму (1985) адкрыта дзяржаўная ўстанова адукацыі **"Яслі-сад №2"** г.Верхнядзвінска.

**4 жніўня — 90 гадоў** таму (1935) нарадзіўся **Ясвін Яўген Станіслававіч** (1935-2000), беларускі мастак, член Беларускага саюза мастакоў. Ураджэнец г.п. Асвея.

**5 жніўня — 90 гадоў** таму (1935) нарадзіўся **Быкаў Уладзімір Арсенцьевіч** (1935-2008), заслужаны работнік сельскай гаспадаркі БССР, перадавік сельскагаспадарчай вытворчасці (1990), былы старшыня калгаса імя Ільіча. Ураджэнец в. Асёткі Верхнядзвінскага раёна.

**10 жніўня — 75 гадоў** таму (1950) нарадзіўся **Сямакоў Мікалай Мікалаевіч** (1950), кандыдат геолага-мінералагічных навук, дацэнт кафедры геафізікі Навасібірскага дзяржаўнага універсітэта. Ураджэнец г.п. Асвея.

**27 жніўня — 105 гадоў** таму (1920) нарадзіўся **Слабада Аляксандр Іванавіч** (1920-2022), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, савецкі партыйны і дзяржаўны дзеяч, Герой Сацыялістычнай Працы, ганаровы грамадзянін г. Любань, ганаровы грамадзянін Мінскай вобласці. Ураджэнец в. Дубровы Дрысенскага раёна (цяпер Верхнядзвінскі раён).

**31 жніўня — 140 гадоў** таму (1885) нарадзіўся **Багдановіч Генадзь Васільевіч** (1885-1937), беларускі грамадскі дзеяч, педагог. Ураджэнец в. Мікалаёва (мяст. Луначарскае) Дрысенскага павета (цяпер в. Луначарскае ў Верхнядзвінскім раёне).





**Антон Станіслававіч Каржанеўскі** нарадзіўся 10 лістапада 1910 года ў вёсцы Валынцы ў сялянскай сям’і. Вучыўся ў Віцебскім мастацкім тэхнікуме (1928-1932). Удзельнічаў у мастацкіх выставах з 1934 года.

У час Другой сусветнай вайны заставаўся з сям’ёй у Мінску. Усе мастакі, якія апынуліся пад акупацыяй, мусілі стаць на ўлік і раз на тыдзень з’яўляцца ва Управу. Іх прымушалі ўдзельнічаць у выставе ў памяшканні Оперы. У снежні 1944 года яго арыштавалі і асудзілі за “супрацоўніцтва з нямецкімі акупантамі” да трох гадоў выпраўленча-працоўных лагераў. У канцы лета 1945 года мастак быў вызвалены, але пасля зноў высланы на 10 гадоў з забаронай жыць у сталіцы.

Імя Каржанеўскага доўга замоўчвалася, нягледзячы на яго талент мастака-пейзажыста. Яму нават не дазволілі зрабіць юбілейнай выставы, хоць Антон Каржанеўскі быў рэабілітаваны і заставаўся сябрам Саюза мастакоў. Гэта забарона дзейнічала пасмяротна.

Працаваў пераважна ў галіне жывапіснага пейзажу. Сярод твораў, якім уласціва насычанасць колеру, выразная мадэліроўка аб’ёмаў, лірычныя пейзажы “Над Свіслаччу” (1938), “Сафійскі сабор у Полацку” (1955), “Апошняе лісце” (1966), “Горад над Дзвіной” (1973), “Стары Віцебск” (1979), “Тужлівая нотка” (1982), “Восеньскі пейзаж” (1984), “Богаяўленскі сабор у Полацку” (1988) і інш. Творы знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, фондах Беларускага саюза мастакоў, Віцебскім абласным краязнаўчым музеі, мэрыі Масквы.

Памёр мастак у 1991 годзе, пахаваны ў горадзе Віцебску.





**Міхаіл Маркавіч Мядзель** нарадзіўся 17 кастрычніка 1910 года ў вёсцы Задзежжа ў сям'і селяніна. Скончыў 7 класаў. Працаваў загадчыкам гаспадаркі на Братцаўскай птушкафабрыцы Маскоўскай вобласці. У 1936 годзе скончыў курсы прапагандыстаў.

У Чырвонай Арміі з чэрвеня 1941 года. Быў старшынёй, намеснікам палітрука, палітруком стралковай роты, парторгам стралковага батальёна. Ваяваў на Заходнім, Бранскім, Цэнтральным, 1-м Украінскім і Варонежскім франтах. У баях тройчы паранены.

Група воінаў, якую ўзначальваў парторг батальёна 1031-га страявога палка, старэйшы лейтэнант Мядзель, пераправілася 25 верасня 1943 года на правы бераг Дняпра на паўднёвы захад ад с. Акунінава (Казелецкі раён, Чарнігаўская вобл.) і з фланга нанесла раптоўны ўдар па ворагу, чым садзейнічала фарсіраванню ракі.

Званне Героя Савецкага Саюза М. М. Мядзелю прысвоена 17 кастрычніка 1943 года. Міхаіл Маркавіч ваяваў і на Далёкім Усходзе. І там ён выконваў свой партыйны і воінскі абавязак. Да канца вайны на яго гімнасцёрцы побач з Залатой Зоркай Героя заззялі ордэн Леніна, два ордэны Чырвонай Зоркі і 6 медалёў.

З 1946 года капітан М. Мядзель — у запасе. Працаваў начальнікам аддзела кадраў, затым дырэктарам Братцаўскай птушкафабрыкі Маскоўскай вобласці.

Памёр 21 студзеня 1981 года, пахаваны на Галавінскіх могілках у Маскве.



# ВЕРАСЕНЬ

**1 верасня — 65 гадоў** таму (1960) была адкрыта дзяржаўная ўстанова адукацыі **"Верхнядзвінская школа мастацтваў"**.

**1 верасня — 10 гадоў** таму (2015) была адкрыта дзяржаўная ўстанова культуры **"Верхнядзвінскі гісторыка-краязнаўчы музей"**.

**13 верасня — 135 гадоў** таму (1890) нарадзіўся **Ляшчэвіч Антоні Янавіч** (1890-1943), каталіцкі свяшчэннік, манах-марыянец, місіянер. Мучанік, благаслаўлёны Рымска-каталіцкай царквы (беатыфікаваны ў 1999 г.). У 1941–1943 гг. – ксёндз у Росіцкім касцёле (Верхнядзвінскі раён). У час карнай аперацыі нямецка-фашысцкіх захопнікаў спалены разам са сваімі вернікамі ў в. Росіца.

**22 верасня — 80 гадоў** таму (1945) нарадзіўся **Квяцінскі Пётр Пятровіч** (1945), краязнаўца, турыст, мясцовы пісьменнік. Пражывае ў аг. Каханавічы .

**29 верасня — 65 гадоў** таму (1960) заснавана дзяржаўная лесагаспадарчая ўстанова **"Верхнядзвінскі лясгас"**. Былая назва Дрысенскі лясгас.

# КАСТРЫЧНІК

**1 кастрычніка — 65 гадоў** таму (1960) была заснавана арцель "Чырвоная зорка", раённы камбінат бытавога абслугоўвання.
Зараз — **ААТ Вытворча-гандлёвае аб'яднанне "Верус"**.

**1 кастрычніка — 125 гадоў** таму (1900) нарадзіўся **Хмялеўскі Мікалай Рыгоравіч** (1900-1980), генерал-лейтэнант авіяцыі, удзельнік грамадзянскай, Вялікай Айчыннай войнаў. Ураджэнец в. Бароўка Дрысенскага павета Віцебскай губерні (цяпер у Верхнядзвінскім раёне).

**1 кастрычніка — 125 гадоў** таму (1900) нарадзіўся **Дубра Антон Вікенцьевіч** (1900-1981), генерал-маёр інтэнданцкай службы, удзельнік грамадзянскай, Вялікай Айчыннай войнаў. Ураджэнец в. Нарушова Асвейскага сельсавета.

**17 кастрычніка — 115 гадоў** таму (1910) нарадзіўся **Мядзель Міхаіл Маркавіч** (1910-1981), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1943). Ураджэнец в. Задзежжа.

**26 кастрычніка — 115 гадоў** таму нарадзіўся **Каранеўскі Мікалай Аляксандравіч** (1910-1978), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, генерал-палкоўнік, адзін з кіраўнікоў савецкай ваеннай разведкі.
Ураджэнец г. Дрыса (Верхнядзвінск).

**30 кастрычніка — 120 гадоў** таму (1905) нарадзіўся **Бембель Андрэй Ануфрыевіч** (1905-1986), народны мастак Беларускай ССР (1955), скульптар. Звязаны каранямі свайго роду з Асвейшчынай.



баі і быў эвакуіраваны самалётам на Вялікую зямлю.

Пасля лячэння ў 1944 годзе Аляксандр Іванавіч Слабада быў абраны сакратаром Гомельскага абкама камсамола, а ў 1946 годзе быў накіраваны на вучобу ў вышэйшую партыйную школу, пасля заканчэння якой з 1948 па 1952 гады працаваў сакратаром Бабруйскага абкама камсамола, з 1952 па 1959 гады — другім сакратаром Слуцкага райкама партыі, з 1959 па 1961 гады — старшынёй Слуцкага райвыканкама. У 1961 годзе быў абраны на пасаду першага сакратара Любанскага райкама партыі.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 22 сакавіка 1966 года за дасягнутыя поспехі ў развіцці жывёлагадоўлі, павелічэнні вытворчасці і нарыхтовак мяса, малака, яек, воўны і іншай прадукцыі А. І. Слабадзе прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы з уручэннем ордэна Леніна і медаля “Серп і молат”.

У 1970 годзе быў прызначаны на пасаду намесніка старшыні Рэспубліканскага камітэта Народнага кантролю БССР, працаваў старшынёй Мінскага абласнога Савета ветэранаў.

Жыў у Мінску. Памёр 14 лістапада 2022 года.

Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР (1963-1967), дэпутат Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь (1990-1994). Удзельнік Парада Перамогі ў Маскве (1995, 2000, 2005).





**Аляксандр Іванавіч Слабада** нарадзіўся 27 жніўня 1920 года ў вёсцы Дубровы. Жылі бедна. Пад адным дахам туліліся тры пакаленні Слабады: дзед Сцяпан і баба Паліна, бацькі, Аляксандр і яго тры браты. Скончыўшы сямігодку, Саша вырашыў паступаць у Полацкі лесатэхнічны тэхнікум. Не хапіла ўсяго паўбала... Прыйшлося застацца ў калгасе – працаваў механізатарам, трактарыстам.

У верасні 1940 года Аляксандр Слабада быў прызваны ў рады РККА. Служыў чырвонаармейцам 27-га асобнага разведвальнага батальёна 53-й стралковай дывізіі Прыволжскай ваеннай акругі.

Ужо з 25 чэрвеня 1941 года Аляксандр удзельнічаў у баях на франтах Вялікай Айчыннай вайны. Баявое хрышчэнне разам са сваім падраздзяленнем атрымаў на рацэ Друць пад Бялынічамі. Наперадзе была жорсткая сутычка з ворагам за Магілёў.

За бai на Буйніцкім полі Аляксандр Іванавіч быў узнагароджаны першым ордэнам Баявога Чырвонага Сцяга. А наперадзе былі баі пад Масквой.

Улетку 1942 года Слабада быў паранены, лячыўся ў эвакашпіталі № 7 у Маскве, пасля чаго быў накіраваны на Калінінскі фронт, дзе ваяваў на пасадзе камандзіра роты аўтаматчыкаў у 5-й гвардзейскай дывізіі.

У пачатку снежня 1942 года быў накіраваны ў тыл праціўніка на Віцебшчыну, дзе стаў камандзірам атрада № 3 партызанскай брыгады імя Ленінскага камсамола. Атрад дыслакаваўся ў вёсцы Стайкава і дзейнічаў у Суражскім і Гарадоцкім раёнах, здзяйсняючы дыверсіі на чыгунках і налёты на гарнізоны праціўніка. Незадоўга да вызвалення раёна Чырвонай Арміяй Слабада быў цяжка паранены ў



# ЛІСТАПАД

**3 лістапада — 125 гадоў** таму (1900) нарадзіўся **Карнавухаў Марка Лукіч** (1900 - ?), савецкі военачальнік, генерал-маёр тэхнічных войск (1949). Ураджэнец в. Гор'е Дрысенскага павета (зараз Верхнядзвінскі раён).

**10 лістапада — 115 гадоў** таму (1910) нарадзіўся **Каржанеўскі Антон Станіслававіч** (1910-1991), беларускі мастак. Ураджэнец в. Валынцы Дрысенскага павета (зараз Верхнядзвінскі раён).

# СНЕЖАНЬ

**10 снежня — 65 гадоў** таму (1960) нарадзіўся **Грамадка Сяргей Мікалаевіч** (1960), генеральны дырэктар ААТ “Інвет”, лаўрэат ганаровага звання “Чалавек года Віцебшчыны-2008”, “Чалавек года Віцебшчыны-2012”.
(г. Верхнядзвінск).

**10 снежня — 100 гадоў** таму (1925) назад нарадзіўся **Капусцёнак Генадзь Уладзіміравіч** (1925-2006), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, пісьменнік, ветэран працы. Ураджэнец в.Фартунава.

**16 снежня — 70 гадоў** таму (1955) быў заснаваны Дарожна-будаўнічы раён № 3 (ДБР-3), з 1956 г. — ДБР-4, з 1981 г. — ДБУ-4. Зараз — **Верхнядзвінскі участак філіяла Дарожна-будаўнічага ўпраўлення-2** адкрытага акцыянернага таварыства “Дарожна-будаўнічы трэст-1 г. Віцебска”.

**30 снежня — 55 гадоў** таму (1970) была адкрыта **УАЗ “Верхнядзвінская цэнтральная раённая бальніца”**.



**Царква ў імя прападобнай Еўфрасінні Полацкай** знаходзіцца каля могілак у в. Бароўка. Пабудавана ў 1840 годзе з цэглы.

Помнік архітэктуры позняга класіцызму. Вырашана працяглым прамавугольным аб'ёмам з бакавымі рызалітамі, накрытымі крыжападобным пакатым дахам, завершаным глухім 8-гранным шатровым драўляным барабанам з макаўкай. Да фасада далучана 3-ярусная 4-гранная званіца-прытвор, накрытая самкнутым сферычным купалам з макаўкай. Атынкаваныя фасады арытмічна члянены арачнымі і прамавугольнымі аконнымі праёмамі і нішамі-экседрамі, крапаваны вуглавымі лапаткамі і парадковымі фрызамі, рустоўкай. Уваход накрыты паўкруглым казырком.

Першапачатковае аблічча царквы значна змянілася з прычыны неаднаразовых перабудоў. У гады савецкай улады ў будынку царквы ў розны час размяшчаліся клуб, склад, крама, і толькі ў 1990-х гадах храм прападобнай Еўфрасінні быў вернуты вернікам.





**Уладзімір Арсенцьевіч Быкаў** нарадзіўся 5 жніўня 1935 года ў вёсцы Асёткі. Скончыў школу механізацыі СПТВ-33, працаваў трактарыстам-камбайнерам Чапаеўскай МТС былога Асвейскага раёна. З 1955 па 1958 гады вучыўся ў сельскагаспадарчай школе па падрыхтоўцы старшынь калгасаў, а з 1958 па 1959 гады працаваў інструктарам райкома ЛКСМБ г. Полацка.

Пасля службы ў арміі, якую Уладзімір Арсенцьевіч праходзіў у 1959-61 гадах, скончыў курсы падрыхтоўкі кіраўнікоў кадраў сельскай гаспадаркі БСГА. Працаваў аграномам калгаса “Камінтэрн” Дрысенскага раёна. А з 1963 па 1998 гады з’яўляўся старшынёй калгаса імя Ільіча.

Вялікі талент кіраўніка, высокія арганізатарскія здольнасці, глыбокае веданне сельскай гаспадаркі дазвалялі старшыні і яго калгасу нязменна ўтрымліваць лідзіруючыя пазіцыі ў раёне ва ўсіх напрамках дзейнасці.

Уладзімір Арсенцьевіч павышаў уласную кваліфікацыю — у 1969 годзе скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію, цаніў добрых спецыялістаў, умеў працаваць з людзьмі.

За высокія заслугі перад Айчынай ён узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, “Знак Пашаны”, медалямі “За працоўную доблесць”, “За добрасумленную працу”, яму прысвоена ганаровае званне “Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі”.

Жыў у вёсцы Нурава. Памёр 24 сакавіка 2008 года.



**Яўген Станіслававіч Ясвін** нарадзіўся 4 жніўня 1935 года ў г. п. Асвея. Скончыў Сталінабадскае мастацкае вучылішча (1960) і Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1966). Вучыўся ў І. Ахрэмчыка. Удзельнік мастацкіх выстаў з 1966 г. Працаваў у станковым жывапісе, пераважна ў жанрах карціны і партрэта.

Асноўныя творы: палотны "Бежанцы", "Старшыня", "З работы", "Смерць партызана", "Невядомы салдат", "Смага", "Вечны агонь", "Вяртанне", "Паядынак", "Зямля", "Лён", "Вершы"; "Партрэт гімнасткі", "Жаночы партрэт".

Член Беларускага саюза мастакоў з 1972 г. Памёр 30 красавіка ў Віцебску.





**Міхась Барэйша** нарадзіўся 4 студзеня 1950 года ў вёсцы Новы Строй у сялянскай сям'і. Вучыўся ў Дзёрнавіцкай васьмігадовай школе. Скончыў Наваполацкі нафтавы тэхнікум і Белдзяржуніверсітэт. Служыў на Балтыйскім флоце, працаваў і жыў у Наваполацку. Кіраваў літаратурным аб'яднаннем "Наддзвінне".

Пачынаў Міхась Уладзіміравіч як паэт, друкаваў свае вершы ў рэспубліканскіх выданнях. А затым перайшоў на прозу. Першы твор увайшоў у калектыўны зборнік "Сустрэчы". У 1980 годзе за публікацыю апавяданняў у часопісе "Маладосць" яму прысуджана прэмія гэтага выдання. М. Барэйша быў удзельнікам VIII Усесаюзнай нарады маладых літаратараў у Маскве. Ён шмат працаваў над сабой і над словам, выступаў і як перакладчык. Кніга прозы "Крыніца, чыстая вадзіца" выйшла ў Мінску ў 1988 годзе.

У 1989 годзе быў прыняты ў саюз пісьменнікаў СССР. Яго імя занесена ў летапіс беларускай літаратуры. Яго творы кранаюць чытача лірызмам, нейкай асаблівай чысцінёй і чалавечнасцю. Цяжкая хвароба не дала магчымасці доўга квітнець таленту. Міхась Уладзіміравіч заўчасна памёр у 1990 годзе.

Пахаваны на могілках каля вёскі Новы Строй.



**Васіль Аляксеевіч Краснік** нарадзіўся ў Жыткавіцкім раёне Гомельскай вобласці. У 1978 годзе скончыў Віцебскі ветэрынарны інстытут.

Сваю працоўную дзейнасць пачаў у Верхнядзвінскім раёне ў 1978 годзе з пасады галоўнага ветурача калгаса ”Новы шлях”. З 1986 па 2003 гг. працаваў старшынёй калгаса ”Кастрычнік”, які ў 2003 годзе быў перайменаваны ў СВК ”Прудзінкі”. За час працы Васіль Аляксеевіч зарэкамендаваў сябе адукаваным і кампетэнтным кіраўніком. Вялікую ўвагу ён надае навядзенню парадку на зямлі, павышэнню эканамічнай эфектыўнасці работы прадпрыемства.

ААТ “Прудзінкі” на працягу многіх гадоў з'яўляецца пераможцам раённага спаборніцтва па вытворчасці і рэалізацыі дзяржаве прадукцыі раслінаводства. У 2012 годзе В.А. Краснік быў удастоены звання ”Чалавек года Віцебшчыны-2011”. З'яўляўся дэпутатам абласнога Савета дэпутатаў. У 2017 годзе за шматгадовую добрасумленную працу, высокі прафесіяналізм, значны асабісты ўклад у развіццё сельскай гаспадаркі Верхнядзвіншчыны быў прадстаўлены да звання Ганаровы грамадзянін Верхнядзвінскага раёна.

Прысвоена ганаровае званне “Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь”.





**Ігар Іванавіч Марковіч** нарадзіўся ў 1960 годзе ў вёсцы Ніжняе Фаміно Верхнядзвінскага раёна. У 1982 годзе скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. У 2009 годзе — Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасці “Дзяржаўнае і мясцовае кіраванне”.

Працоўную дзейнасць пачаў у 1982 годзе ў саўгасе “Дрысенскі” Верхнядзвінскага раёна, дзе працаваў інжынерам-механікам, інжынерам па тэхніцы бяспекі і арганізацыі пажарнай аховы, загадчыкам майстэрняў, галоўным інжынерам. З 1987 па 1990 год — інструктар сельскагаспадарчага аддзела, затым інструктар арганізацыйнага аддзела Верхнядзвінскага райкама КПБ Віцебскай вобласці. У 1990 годзе ўзначаліў Верхнядзвінскае КУП па вытворча-тэхнічным абслугоўванні раённага аграпрамысловага аб’яднання Віцебскай вобласці, з 2003 года — гендырэктар ААТ “Верхнядзвінскі райаграсэрвіс”.

У сакавіку 2007 года прызначаны старшынёй Верхнядзвінскага райвыканкама. За час працы на пасадзе старшыні Верхнядзвінскага райвыканкама Ігар Іванавіч зарэкамендаваў сябе здольным арганізатарам, ініцыятыўным, прынцыповым кіраўніком. 26 снежня 2019 года прызначаны старшынёй Полацкага райвыканкама.

У 2016 годзе ўзнагароджаны ордэнам Пашаны. У 2020 годзе за вялікі асабісты ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё Верхнядзвінскага раёна, будаўніцтва і рэканструкцыю аб'ектаў сацыяльнай сферы, добраўпарадкаванне населеных пунктаў быў прадстаўлены да звання “Ганаровы грамадзянін Верхнядзвінскага раёна”.



**Валерый Аляксандравіч Старынскі** нарадзіўся 18 мая 1940 года ў вёсцы Бароўка.

У 1957 годзе скончыў Дрысенскую сярэднюю школу, Друйскае ТВ-11 па спецыяльнасці — машыніст экскаватара. Са жніўня 1959 года па верасень 1964 года працаваў на будаўніцтве НПЗ, Паліміра і на розных аб'ектах Наваполацка і Полацка.

У 1969 годзе закончыў аўтатрактарны факультэт Беларускага палітэхнічнага інстытута. Актыўны ўдзельнік канцэртаў мастацкай самадзейнасці, чытальнік, спявак. З 1965 па 1968 год — старшыня літаб'яднання пры інстытуцкай газеце "Савецкі інжынер". Скончыў пры інстытуце тэатральную студыю.

У Наваполацку быў удзельнікам літаб'яднання "Крыніцы". З 1969 года перыядычна друкаваўся ў газетах "Хімік", "Новая газета". Са сваімі вершамі выступаў у Дамах культуры, школах, бібліятэках. Пісаў на свае вершы музыку.

Друкаваўся ў рэспубліканскай перыёдыцы і калектыўных зборніках: "Русло" (1997), "Логос" (2004). Выпусціў чатыры кнігі вершаў: "Ветразі жыцця", "Любовь и боль", "И сердце в сердце стучится…", "Плач жураўліны". З'яўляўся ўдзельнікам беларускага літаратурнага саюза "Полоцкая ветвь".







**Сямён Аляксандравіч Забагонскі** нарадзіўся 14 студзеня 1910 года ў в. Залучча.

Працаваў у калгасе. Член КПСС з 1944 года. У верасні 1941 года прызваны ў Чырвоную Армію. З таго ж года ваяваў на Заходнім, Цэнтральным, Варонежскім, 4-м Украінскім франтах. Памочнік камандзіра ўзвода, сяржант С. А. Забагонскі вызначыўся пры вызваленні Кіеўскай вобласці. У ноч на 24 верасня 1943 года на чале групы разведчыкаў фарсіраваў Дняпро на поўнач ад г. п. Ржышчаў, светлавымі сігналамі паказаў месца для прычальвання лодак і плытоў. Падраздзяленні палка паспяхова пераправіліся цераз раку. Удзельнічаў у баі за плацдарм, адбіцці контратак.

Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена ў 1943 годзе.

Пасля вайны працаваў старшым лесааб'ездчыкам райлясгаса ў Томскай вобласці. З 1951 года жыў у в. Кацярынаўка Ленінградскай вобласці, працаваў ляснічым.

Памёр Сямён Аляксандравіч 27 студзеня 1955 года. Пахаваны ў Санкт-Пецярбургу. У вёсцы Залучча ў памяць аб С. А. Забагонскім устаноўлена стэла.



Айцец **Чэслаў Курэчка** нарадзіўся і вырас у Браслаўскім раёне. Пасля сканчэння ў 1989 годзе Рыжскай духоўнай семінарыі пачаў душпастырскую дзейнасць. З 2007 года з’яўляецца пробашчам парафіі Святой Тройцы ў Росіцы. Айцец Чэслаў Курэчка мае талент духоўна ўзмацняць людзей і ствараць прыгажосць вакол сябе, прыкладае вялікія намаганні для таго, каб святыня і ўсё навокал добра выглядала. Дзякуючы святару былі створаны Алея Памяці і Алея благаслаўлёных Антонія Ляшчэвіча і Юрыя Кашыры, заўсёды добраўпарадкаваны вадаёмы, з густам высаджаны кветкі. Шмат увагі святар надае працы з моладдзю. Пры касцёле быў праведзены пленэр маладых мастакоў вобласці.

Атрымаў званне “Чалавек года Віцебшчыны-2013” за актыўную дзейнасць па духоўным асветніцтве грамадства, прапаганду гісторыі і культуры беларускага народа, рашэнне пытанняў добраўпарадкавання.

У 2016 годзе прысуджана прэмія Прэзідэнта Беларусі “За важкі ўклад у захаванне міжканфесійнага міру і нацыянальнай згоды”, а таксама “За ўдзел у духоўна-асветніцкай дзейнасці краіны і прапагандзе здаровага ладу жыцця”.





Імя гэта вядома ўсім яшчэ па школьных уроках геаграфіі. Горад Чэрскі на Калыме, краж Чэрскага ў Забайкаллі, гара Чэрскага пад Іркуцкам, даліна Чэрскага ў Саянах.

Між тым, **Іван Дамінікавіч Чэрскі** — наш зямляк. Месца яго нараджэння — в. Свольна Дрысенскага павета. Чэрскі — шляхецкага паходжання. Вучыўся ў Вільні, у дваранскім інстытуце. За ўдзел у паўстанні 1863-64 гадоў быў з яго выключаны, здадзены ў салдаты і адпраўлены ў Сібір. Праз 5 гадоў ад службы вызвалены — пагоршылася здароўе. Ва ўніверсітэт яго не прынялі, як палітычнага злачынцу. Усходне-Сібірскі аддзел Рускага геаграфічнага таварыства запрасіў Чэрскага на працу.

Наш зямляк займаўся геалагічнымі і палеанталагічнымі даследаваннямі ў Саянах і Прыбайкаллі, у басейнах Ангары і Ніжняй Тунгускі. Вывучаў будову берагоў Байкала і склаў першую геалагічную карту яго ўзбярэжжа. Іван Дамінікавіч вывучаў мову і звычаі якутаў, юкагіраў, эвенаў.

Памёр 7 ліпеня 1892 г. і пахаваны ля Калымы.

Філіял “Валынецкі краязнаўчы музей імя І. Д. Чэрскага” ДУК “Верхнядзвінскі гісторыка-краязнаўчы музей” знаходзіцца ў аграгарадку Валынцы.